Пролетарыі усіх краёў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА І СЯЛЯНКА



ВЫСТУПЛЕНЬНЕ НА ЗЬЕЗЬДЗЕ САВЕТАЎ

НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ—ДЗЕНЬ УСЯСЬВЕТНАГА ПРОЛЕТАРСКАГА АДЗІНСТВА,

ДЗЕНЬ БАЯВОГА ПРЫЗЫВУ ДА БАРАЦЬБЫ ЗА КОМУНІЗМ

№ 4 (30)

ОРГАН АДДЗЕЛУ ПА ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

КРАСАВІК 1927 год.

Куда обращаться, когда не получается журнал.

За последнее время редакция журнала „Беларуская Работніца і Сялянка" стала получать жалобы на неполучение нашего журнала.

Редакция может повести решительную борьбу с перебоями в доставке нашего журнала, если все неполучающие журнал будут немедленно сообщать об этом в редакцию.

Журнал выходит с таким расчетом, чтобы на местах его бы получили не позже 30-го каждого месяца. Если к этому сроку подписчик не получит журнала, то необходимо ему немедленно обращаться туда, где была сделана подписка, пред'явив квитанцию. Если там дадут исчерпывающую справку о причине неполучения журнала, то необходимо написать в редакцию и подробно указать: где была сделана подписка (на почте, у письмоносца и т. д.), под каким номером выдана квитанция и на какой срок (на какие именно месяцы) и на какой адрес выслать журнал.

Получив сообщение, редакция немедленно вышлет указанные журналы.

Если же деньги были пересланы переводом по почте, то необходимо сообщить: где деньги были сданы, номер квитанции и пересланную сумму.

Обо всех случаях недоставки журнала редакция будет производить расследования.

Перапіска з нашымі корэспондэнтамі.

Верагиной. Прочтите ответ на свою корреспонденцию в нашем журнале № 3 (29). Вы послали ту же заметку второй раз.

О случае избиения пьяным мужем жены напишите подробно, указавши фамилию и адрес его, только тогда редакция сможет это дело расследовать и если факт подтвердится, то муж, который избивает свою жену, понесет соответствующее наказание.

Стихи ваши слабо написаны, печататься в нашем журнале не будут.

Редакция вторично просит вас писать о практической работе.

М. Г. „Засталіся здаволены"—ня пойдзе. Ваша заметка ня мае ніякай цікавасьці. Як вы ехалі, то гэта для чытача няцікава, а трэба даць такі факт, каб ён зацікавіў ня толькі вас адных, але ўсіх чытачоў.

Ваш верш, таксама ня пойдзе. Ён больш падобен на прозу.

Пішэце, якія сяляне ўводзяць культурныя расьліны і ці ёсьць ад іх якая-небудзь карысьць у гаспадарцы. Ці пераходзіць ваша вёска на шматпольле, ці будуць у гэтым годзе ў вашай вёсцы адчынены дзіцячыя ясьлі, а калі будуць, то хто іх адчыняе.

Известной. „Как искоренить темноту"—не пойдет. Нет фактов. Общие рассуждения.

Лившиц Л. Ваше стихотворение слабо написано, нет смысла во всем его содержании. Заметки также не будут помещены. Пишите покороче и о практической работе, не вдавайтесь в общие рассуждения. Ждем от вас нового материала.

Новиковой. Ваша заметка не пойдет. Напишите нам, как сейчас работает делегатское собрание (факты), что делегатки практически успели сделать, как они себя оправдали на общественной и хозяйственной работе.

Барэйка М. Вашы ўспаміны пра цяжкія гады—ня будуць зьмешчаны. Пішэце аб сучасным жыцьці, аб працы жанчын у сельсавеце, камітэце ўзаемадапамогі і г. д.

Кароткай Е. Ваша заметка ня мае ніякай цікавасьці для чытача. Агульныя разважаньні. Пішэце аб земляўпарадкаваньні і аб тым, як сялянкі перабудоўваюць сваю гаспадарку на новы лад, якія ўводзяць культурныя расьліны. Як сялянка змагаецца з рэлігійнымі забабонамі (факты).

Жуковой. О праздновании 8-го марта опоздало.

Велич, Гуревич З., Палужчыку, Гузман Р., Метной, Жук, Селькорке К., Родовой, Свириновской, Павловской—ваш материал будет помещен в следующем номере.

З Ь М Е С Т.

Первое мая. *Пятро Глебка*—У першамайскія дні (верш). *А. С.*—День печати и наши задачи. Чытачы аб журнале. *Л. Сьвідэрская*—Сьвята вясны (апавяданьне). *Р. К-н*—Что сказал 8-й С'езд Советов. *У. Б.*—Словы дэлегатак на 8-м Усебеларускім Зьездзе Саветаў. На производстве. Жыцьцё і барацьба замежных рабочых і сялян. 1 мая и заграничная работница и селянка. *Е. К.*—Укрепляем ряды МОПР'а. Жыцьцё работніцы і сялянкі. Строим ясли. Охрана здоровья. Сельская гаспадарка. Суд і быт. Карысныя парады ў гаспадарцы. Перапіска з нашымі корэспондэнткамі.

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45.
Тэлефон № 419.

ОРГАН АДДЗЕЛУ ПА ПРАЦЫ СЯРОД ЖАНЧЫН ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . . 15 кап
„ 3 „ . . . . 45 „
„ 6 „ . . . . 90 „
На год „ . . . 1 р. 80 „

№ 4 (30) | Красавік 1927 г. | № 4 (30)

Инв. 1962 г. 12 800

ПЕРВОЕ МАЯ

1 ое мая—великий праздник пролетарской солидарности, демонстрация сил и единства рабочих отрядов всего света.

1-ое мая—великий международный праздник труда. В этот день революционные труженики всех стран высыпают на улицу и становятся под красные революционные знамена.

В этот день за рубежом, в странах, где власть в руках буржуазии, пролетарии демонстрируют, оцепляемые полицейскими и жандармами, преследуемые угрозами, насмешками, осыпаемые бранью и злобными взглядами буржуазии.

Только в нашей стране, в СССР, трудящиеся празднуют свой светлый праздник свободно и радостно, как хозяева социалистического государства. Уже 11-й год народы вольного СССР свободно празднуют великий день международного праздника труда.

Вместе с рабочим классом в ногу с ним продемонстрируют свою готовность к борьбе, свою готовность к участию в великой созидательной работе работницы и крестьянки.

Скоро наступит десятилетие Октябрьской революции. Еще через полгода мы будем праздновать десятилетие победы пролетариата, десятилетие пролетарской диктатуры. За это 10-тилетие рабочие и крестьяне под неизменным руководством Коммунистической партии сумели не только до основания уничтожить самодержавный строй, не только отвоевали землю у помещиков и фабрики у капиталистов, но и отстояли эти завоевания в кровопролитной борьбе с бесчисленными врагами, начали строить, создавать новое, улучшать свое положение. Много сделано за период мирного строительства. Усилиями мозолистых рук рабочих и крестьян, под руководством Коммунистической партии, народное хозяйство нашего Союза: промышленность, земледелие, торговля, транспорт, доведены до довоенного уровня. В некоторых отраслях мы перешагнули даже довоенную черту. Мы все время движемся вперед по пути к дальнейшему укреплению нашего народного хозяйства.

У нас есть трудности международного характера, которые состоят в том, что мировой буржуазии удалось, хотя и временно, хотя и крайне неустойчиво, но укрепить свое положение. Этот международный капитал, при поддержке и помощи вождей соглашательских партий, ведет наступление на рабочий класс в капиталистических странах и пытается задушить начавшееся национально-освободительное движение в Китае и в других колониальных странах.

Международный капитал усиленно готовится к борьбе с нами и строит бесчисленные козни против единственного на всем земном шаре рабочего государства.

У нас имеются также и трудности внутри страны, трудности строительства. Нам необходимо усилить развитие крупной промышленности в нашей стране. Мы взяли твердый курс на индустриализацию, т. е. развитие крупной промышленности в нашей стране, чтобы наша страна сама могла производить машины, чтобы мы не стали придатком капиталистического мира.

Мы справимся с этими трудностями, если производительность труда на наших фабриках и заводах, на полях и учреждениях подымется все выше и выше, если мы во всем будем соблюдать строжайшую экономию и каждую свободную копейку будем вкладывать в дело строительства нашей социалистической промышленности, если мы будем проводить неустанную борьбу за снижение цен, борьбу с бюрократизмом, с расхлябанностью.

В наш великий первомайский праздник мы остаемся попрежнему уверенными в своих силах. Мы знаем, что мы перешагнули еще больше трудностей, мы не сомневаемся в победе, потому что у пролетариев Советского Союза есть мощный вождь—*Коммунистическая партия.*

Сплоченностью вокруг Коммунистической партии, вокруг ее лозунгов побеждали рабочие Советского Союза. Сплоченностью вокруг Коммунистической партии при тесном союзе рабочих города и бедняков деревни с середняками—мы придем к окончательной победе.

В день 1-го мая трудящиеся всего мира и нашего Союза вспомнят добрым словом нашу Красную армию, как единственную защитницу интересов труда и мира во всем мире.

Мы шлем самый пламенный привет нашим дорогим зарубежным братьям, иностранным рабочим, и крепко-крепко жмем им руки.

В день 1-го мая мы шлем особенно горячий привет революционным рабочим и крестьянам Китая и Западной Белоруссии.

БССР ІМЯНІ ЛЕНІНА

Пятро Глебка.

Заўсёды, як радасьць у сэрцы,
мінулае ўспомніш міжволі:
жылі мы, гнілі ў паняверцы,
ня мелі ні шчасьця, ні долі.

Красуня-дзяўчына Марыля:
у вочах нябесны блакіт...
Казалі калісь, гаварылі,
што будзе й яна галасіць.

Марыля—батрачкай у пана,—
сама не чакала ніколі,
што прыдзе часіна, настане
часіна батрацкае долі.

Марыля цяпер у савеце—
хто можа імкненьне стрымаць!
У горад да шэфаў вось едзе
спаткаць разам з імі свой май.

Сакочуць па рэйках вагоны,
мігаюць палеткі, лясы.
Вясна зацьвітае сягоньня
і новае многа красы.

Здаецца, што людзі ніколі
ня ведалі гэткай вясны:
сэрца ад радасьці коле,
снуюцца прыгожыя сны.

Думае думы Марыля,
паўстала мінулае ў вочах...
Імчыцца цягнік, як на крыльлях,
вагоны па рэйках сакочуць.

Сонца зьнікае за ўзгоркам,
сьцелецца сівы туман,
палі ахінаюцца змрокам,
а гораду, 'шчэ ўсё няма.

І вось замігалі далёка
у волкім тумане агні...
Думы ўзьвіліся высока,—
імчыцца, імчыцца цягнік.

Агні усё бліжай мігаюць,
гмахі пасталі, як горы.
Марыля у думках вітае,
вітае рабочых і горад.

* * *

Май—гэта сьвята працоўных,
на вуліцах сьцягі шасьцяць
шумліва і неяк цудоўна,
як быццам-бы казка жыцьця.

Як мора, людзей на бульвары:
сягоньня сусьветны парад...
Майская радасьць на тварах,—
загэтым і вочы гараць.

Марыля таксама ў парадзе;
работніца з фабрыкі з ёй—
гаворыць Марылі і радзіць,
як будаваць трэ' жыцьцё.

Успомнілі гора, нядолю,
успомнілі цяжкі свой лёс,
калі на заводзе і ў полі
возера вылілі сьлёз.

— Паслухай, сястрыца, ці знаеш,—
гаворыць работніца так:—
мы вольна тут май сустракаем,
а дзесьці іначай... ня так...

— Я помню, бывала, таксама
выходзілі май прывітаць;
і кроў разьлівалася плямай,
у кроў афарбоўвалі сьцяг.

— Ня йначай цяпер на Захо́дзе,
на Ўсходзе таксама ня йначай:
мы з песьняй па вуліцах ходзім,
а там паміраюць... і плачуць...

Замоўкла чамусьці ў раздум'і,
за руку сялянку ўзяла...
Нахлынулі розныя думы,
Марыля яе абняла.

Ня вецер гуляе у кусьце,
а сьцягі узьвеялі ў сінь...
Адна у чырвоненькай хустцы,
другая бяз хусткі зусім.

Ідуць яны, сьцягі іх крыюць,
а сонца у косах жартуе,
і верыцца, й хочацца крыкнуць:
Камуну яны пабудуюць!



ДЕНЬ ПЕЧАТИ И НАШИ ЗАДАЧИ

Пролетарская печать, являющаяся мощным органом диктатуры победившего класса, имеет свои традиции, свои юбилеи. Таким юбилеем нашей пролетарской печати является юбилей „Правды", первого ежедневного органа нашей партии, появившегося на свет 5 мая 1912 года. Отсюда и установилось считать этот день—днем своей пролетарской печати.

В этот день мы под'итоживали успехи и недочеты „шестой державы"* приковывали внимание рабочего класса и всех трудящихся к вопросам печати, делаем смотр нашей боевой рабселькоровской рати, останавливались на задачах печати, а также и на том, как печать с этими задачами справляется.

К десятилетию Октября, к своему 15-тилетнему юбилею, пролетарская печать достигла громадных успехов. В то время, как до революции читателем газет, журналов, были привеллигированные классы, а рабочий подписчик, рабочий корреспондент был своего рода редкостью, в настоящее время тираж** газет и журналов превысил в несколько раз тиражи дореволюционного времени. Основным подписчиком, читателем является рабочий и работница, газета попадает почти в каждый десятый двор крестьянина.

Октябрьская революция создала новую армию, невиданную в капиталистических странах—армию рабочих и крестьянских корреспондентов. Сотни тысяч пролетарских и крестьянских перьев, выводят, часто каракулями, на свет все темное, загнившее, оставшееся нам в наследство от проклятых ушедших времен. „Травля всего негодного, призыв учиться у хорошего"—этот Ленинский лозунг наша рабселькоровская армия с успехом выполняет. Когда мы делаем смотр рабселькоровской армии в эти дни, мы не можем не заметить, что работница корреспондентка, а также и крестьянка составляют в этой армии еще небольшое количество. В течение двухнедельника печати мы должны провести мощную кампанию по повышению интереса женщины-труженицы к печатному слову, по вербовке женкоров из среды работниц и крестьянок.

Говоря об общих достижениях и недочетах, мы должны остановиться на тех основных лозунгах в отношении печати, которые завещал нам Ленин. А наш великий учитель сказал, что: „мы не умеем вести классовой борьбы в газетах так, как ее вела буржуазия". Ленин писал: „О политике можно и должно говорить, но говорить коротко. Побольше экономики. Но экономики не в смысле общих рассуждений, интеллигентских планов и т. п. дребедени... Нет, экономика нужна нам в смысле собирания, тщательной проверки и изучения фактов действительного строительства всей жизни". Вот этот Ленинский лозунг нами не всегда выполняется. Возьмем ли мы борьбу с бюрократизмом или кампанию по снижению цен, мы на страницах нашей прессы найдем много „общих" статей, интеллигентских рассуждений и мало пишется о том, как, например, на деле проводится снижение цен по данному кооперативу, по данному товару.

Есть у нашей печати еще и другой грех: мы небрежно относимся к печатному слову, к тому, что мы пишем, и как мы пишем. Наша печатная речь часто казенная, замысловатая, мало понятна для рабочего и крестьянина. Мы не экономим словом и своим многословием часто затемняем смысл того, что желаем передать. Мы не научились передавать факт, идею в живой, понятной форме. Отсюда перед нами стоит задача поднятия квалификации работников пера. Политико-воспитательная работа среди рабселькоровской армии должна быть поднята на соответствующую высоту.

Из наших достижений в условиях Белоруссии нельзя не отметить роста национальной печати. К этому времени почти все окружные газеты перешли на белорусский язык. Вся комсомольская пресса издается на национальных языках, белоруссизируются и центральные газеты. Центральная Крестьянская газета „Беларуская вёска" повысила тираж от 3000 в 26 году до 15 тысяч в этом. Увеличился тираж (6.500), улучшился качественно журнал „Работніца і Сялянка". Журнал становится настольной книгой труженицы города и деревни.

В двухнедельник печати мы должны добиться, чтобы каждая грамотная работница и крестьянка стала читателем и корреспондентом „Работніцы і сялянкі". Журнал должен быть на каждой фабрике, в каждой глухой деревушке. Мы должны привлечь женщину-труженицу к чтению и корреспондированию и в остальной пролетарской печати.

А. С.

* „Шестой державой" называют печать.
** Тираж—количество экз.

РАБОТНИЦЫ, КРЕСТЬЯНКИ И ЖЕНЫ РАБОЧИХ—ВСЕ КАК ОДНА—НА ПЕРВОМАЙСКИЕ ДЕМОНСТРАЦИИ.

Куток часопісі „Беларуская работніца і сялянка"

ЧЫТАЧЫ АБ ЖУРНАЛЕ.

Выдаём насьценную газэту.

(Самахвалаўскіраён, Меншчына).

У 1927 годзе ў вёсцы Бардзілаўка пры насьценнай газэце організаваўся селькораўскі гурток. Гурток яднае ў сабе 8 чал., у тым ліку 3 жанчыны.

Адна жанчына і два мужчыны пішуць у цэнтральныя беларускія газэты і часопісі, а астатнія прымаюць актыўны ўдзел у насьценнай газэце.

Асабліва вялікі актыў праяўляюць жанчыны, пішучы ў насьценную газэту.

Раней мы працавалі па-асобку, і гэта адбівалася на працы, напрыклад: насьценная газэта выпускалася адзін раз у 2-3 месяцы, а цяпер—штомесячна.

Праводзяцца селькораўскія сходы, якімі вельмі цікавіцца сялянства: на сход прыходзяць за 2-3 вярсты.

Выпісваецца гуртком літаратура: газэты, часопісі і г. д.

Гуртком кіруе комсамол і трымаем сувязь з райкомам партыі. Райком дапамагае нам у выданьні насьценнай газэты і як пісаць у яе.

Заняткі адбываюцца адзін раз у тыдзень Акрамя ўсяго гэтага, гурток вядзе працу сярод сялянства, тлумачачы, якое значэньне маюць газэты і часопісі.

Селькорка.

Чытаем і распаўсюджваем сваю часопісь.

(Мястэчка Семежава, Слуцкай акругі).

У канцы 1926 году нашы дэлегаткі пазнаёміліся з часопісьсю „Бел. Раб. і Сял.". Кампанія, праведзеная па распаўсюджваньню часопісі, дала добрыя вынікі. Дэлегаткі падпісваліся калектыўна і індывідуальна.

Цяпер на дэлегацкіх сходах праводзім чытку, і ўсе прысутныя застаюцца вельмі здаволены часопісьсю. Яна адпавядае ўсім запатрабаваньням жанчын і мае вельмі добры выгляд.

Дэлегатка **П. Мацкевіч.**

Патрэбна больш выкраек.

(Бігосаўскі сельсавет, Дрысенскага раёну, Полаччына).

Калі часопісь стала даваць выкрайкі і старонку ручной працы—жанчыны пачалі ахвотна выпісваць яе. Бігосаўскай жанорганізацыяй выпісваецца больш 30 экз. Гэтак сама добра, што даюцца карысныя парады ў гаспадарцы і парады дактароў.

Патрэбна даваць больш выкраек для дзіцячай адзежы.

Жанорганізатар **Лебедзеў.**

Мой привет.

Я была совершенно отсталой женщиной и никогда не думала, что я буду когда-либо избрана делегаткой. В этом помогает мне журнал „Работніца і Сялянка", и сейчас я стала сознательной делегаткой.

Шлю горячий привет в „День Печати" нашему организатору—журналу „Беларуская Работніца і Сялянка".

Кустарка **Рахиль Эфрон.**

Часопісь—наша абаронца.

(Бесядзкі сельсавет, Лагойскага раёну, Меншчына).

Наш сельсавет самы глухі, і аб існаваньні жаночай часопісі амаль што ніхто ня ведаў. Адзін раз я ў хаце-чытальні ўбачыла сваю родную часопісь „Бел. Раб. і Сял." Я яе прачытала спачатку аж да канца і знайшла вельмі шмат карыснага матар'ялу для сябе, напрыклад: карысныя парады ў гаспадарцы, парады дактароў, а разам з гэтым ведаю, як жыве і працуе наша работніца і сялянка і як жывецца замежным братом і сёстрам.

З гэтага часу я пачала заўсёды выпісваць сваю часопісь, а гэтак сама ўцягваю і іншых жанчын.

Калі атрымоўваем сьвежы экз., мы з вялікай ахвотай накідваемся на яго і па некалькі разоў прачытваем кожны артыкул.

Сама выпісваю і заклікаю іншых выпісаць, бо часопісь—наша абаронца.

Сялянка **Ф. Г—ва.**

Часопісь заваявала аўторытэт.

(Вёска Галынка, Бабруйскай акругі).

Трэці год часопісь „Работніца і Сялянка" змагаецца з цемрай, забабонамі, знахарствам і г. д. Часопісь стараецца вывесьці з цемры сялянку, даючы розныя парады.

Наша селькорка Антановіч Марыя.

Першы раз, калі часопісь папала ў нашу вёску, то мужчыны сьмяяліся, кажучы. „гэта лішняя работа, адымае ў баб час".

Калі спачатку выпісваўся толькі адзін экз., то цяпер выпісваецца больш пяці. І мужчыны цяпер перасталі сьмяяцца, бо яны ўбачылі, што часопісь не навучае дрэннаму.

Нам, селькоркам, трэба самым стараццa ўцягнуць больш жанчын у працу нашай часопісі, а разам з гэтым і распаўсюджваць яе.

У „Дзень Друку" мы павінны яшчэ крапчэй згуртавацца навакол сваёй часопісі.

Антановіч.

(Апавяданьне).

I.

Дзень ясны і сьветлы, пахне раллёй і прэласьцю леташняга іржышча.

Блішчаць дарогі ад нявысахшай вады, мясцамі ляжыць сьнег, пачарнеўшы і жоўты. За полем, за нашымі шнурамі прайшоў цягнік, і маршам свайго шыбкага ходу, крыкам сьвістка парушыў ціш поля і вёскі. Паравозу ўжо ня было відаць, а між хвой і елак лесу ўсё яшчэ мільгалі вагоны, а на іх ляжала, ці мо' так здавалася, нейкае ламаччо...

— Гэта, мусіць, таварны?—сказаў Юзік Цісьлеўскі, і твар яго аліўкавага цьвету, чуць загарэўшы ад яшчэ не гарачага вясеньняга сонца, усьміхнуўся.

— Ці ня плугі павезьлі?—падаў голас Язэп Мілановіч, сталы з падсьлепаватым вокам чалавек.

— Казалі-ж у мястэчку, што плугі прывязуць скора, ды яшчэ нешта... А-а... каб цябе... што-ж гэта?..

— „Трахцель",—падсказваюць з грамады, і пры гэтым Юзік Цісьлеўскі пачынае ўсьміхацца.

— Трактар, а не „трахцель",—папраўляе ён.—Бачыў я гэты самы трактар,—гаворыць ён з дзіцячым выглядам твару.—Бачыў я яго ў саўхозе. Гэта сядзіць, пане мой, на ім чалавек і толькі кіруе... а ён, брат, верне зразу некалькі скіб.

— Мана! Як ён зможа вярнуць зразу некалькі скіб?!—адазваўся Сыманчук і ўставіў свае вочы, поўныя злоснай насьмешкі, на Юзіка.

— Табе ўсё мана?!—загарачыўся Юзік.—Табе ўсё мана?! Вунь мы з маханікам з Гарадка ўводзілі „радзію"—таксама ты біў, як у бубен, што гэта выдумка, што яна сама ня будзе гаварыць. А калі мы стаялі за пасёлкі і абразалі тваю зямлю, ты што-о тады казаў?! Га-а!..

— Гавары з п'яным пацеры,—плюнуў Сыманчук і пайшоў.

— Ты вельмі-ж стаў разумным,—падаў ён здалёку голас.

— Да цябе па розум не пайду,—гукнуў уздагон яму Юзік.

Юзіка гэта расьсердзіла. Ён кінуў грамаду і сьценкай пайшоў у бок свайго пасёлку.

На спатканьне яму ціха шумеў лес, далёка, на краю неба, зьбіраліся хмары.

„Няўжо пойдзе дождж", падумаў Юзік і пашоў далей, на ўзгорак, да свайго пасёлку. „Хаця-б ня йшоў,—думаў ён ідучы,—хутчэй бы сяўба падышла".

Адгэтуль, з узгорка, як на далоні, была відна сяліба Сыманчука. О, як яго ня любіў Юзік! Ён ня мог успомніць пра яго без абурэньня, ня сьціснуўшы кулакі. Ён усё мсьціць яму, Юзіку і Арыне, што праз іх абрэзалі ў яго зямлю, з'арганізавалі на ёй пасёлак.

Юзік не агледзіўся, як ён падышоў пад новыя смалістыя хаты пасёлку, на дзьвярах якога красуецца надпіс: пасёлак „Чырвоная Культура".

II.

Цьвіла і адцьвітала зямля, ішлі па ёй зорныя, п'яныя ночы, птушкі радаснымі сьпевамі віталі нараджэньне новага дню. Але гэта як-бы не прыкмячалася — цягнулася гэта жыцьцё так сотні год, спрадвеку. І ў жанчыны, яшчэ ў маладых гадох, твар быў бляды, жоўты і вялы ад жыцьця.

У Рыгора Малішэўскага, што жыў у крайняй хаце вёскі, былі дзьве дачкі—Арына і Маня.

Хата Рыгора была нізкая, змрочная нават і днём. Ноччу з вуглоў, з-за печкі вылазілі прусакі і шавялілі сваімі вялікімі вусамі. На раніцу, пад лавамі валялася новая абгрызеная бульба—гэта начная работа іх.

І ніхто з хатніх нават і пальцам ня сьмеў крануць, каб зьмяніць гэты пастаянны ўклад жыцьця. І ўсё гэта нібы было ўстаноўлена самім жыцьцём, нібы нехта зрабіў так і сказаў, каб тут ня было нічога кранута датуль, пакуль яно само цалкам не адыйдзе ў нябыт.

І цягнулася гэта жыцьцё так—у вечнай турбоце, у клапотах па куску хлеба. Рыгор, ходзячы на заработкі з тапаром, зьлёг ад хваробы, і яму адабрала нагу. Тады, пасьля гэтага выправілі на службу яшчэ малых—Маню і Арыну,—дома з хворымі бацькамі застаўся толькі адзін малы іхні брацік Сымонка.

III.

Маня сьпярша служыла ў тутэйшых фальваркоўцаў, а потым падалася на службу ў горад. „На завод"—хадзілі чуткі па вёсцы. Яна кожны месяц прысылала бацьком грошы на пражыцьцё і яшчэ часта прысылала нейкія пісьмы Арыне, якіх тая ня ўмела чытаць і насіла яна іх да настаўніцы, у мястэчка.

Дзіўныя былі гэтыя пісьмы!

Арына, так добра разумеючы сястру сваім дзявочым сэрцам, і так, як ніхто, ведаўшы гора, магла з пісем схваціць адно—гэта тое, што сястры ня соладка жывецца, і што там недзе нешта робіцца для палепшаньня гэтага жыцьця. А калі настаўніца пачынала што-небудзь тлумачыць Арыне, яна прарывала яе і казала:

— Не, не, ня трэба—я сама ведаю, для мяне ясна ўсё, як дзень.—І Арына пасьля сваіх слоў прыкмячала на твары настаўніцы нейкую, затаёную ад яе, ціхую радасьць.

А калі Арына пачынала жаліцца ёй на жыцьцё сваё, на кепскія адносіны Сыманчука, у якога яна служыла, і пачынала плакаць, настаўніца гаварыла:

— Сястрыца, хто з нас лепш жыве?!

А калі выходзіла Арына ад настаўніцы, дзе цяжкае жыцьцё яе на хвіліну адлягала, яно зноў пачынала душыць яе. І зноў сьлёзы крыўды і жалю падступалі пад горла ёй, калі яна ўспамінала кпіны і лаянку Сыманчука. Не хацелася ісьці ёй да яго, а ісьці, вот так ісьці пад гэтым сонцам і адчуваць яго сьветласьць у душы сваёй. І з усім сьветлым і радасным Арына зьвязвае адзін дзень у жыцьці сваім, гэта—вясеньні і сонечны дзень, у які Арына хадзіла да настаўніцы чытаць новае пісьмо ад сваёй сястры Мані. Тая пісала пра нейкую забастоўку, пра вясну, пра май, пра нейкае сьвята, што сьвяткуюць яго на ўсёй зямлі, пра дэмонстрацыю.

І гэта ўсё ня то што, каб добра разумела Арына, але неяк яно ўсё само знаходзіла водгук у душы яе, і яна толькі ўяўляла сонца і шэрагі людзей, а на іх тварах радасьць. Сьпярша Арына зарадавалася нечаму, а пасьля пачала плакаць і расказваць, як сёньня Сыманчук прымушаў яе насіць не па сіле мяшкі і пагражаў пабоямі.



І ўсё жыцьцё яе, жыцьцё сьлёз і гора, жыцьцё насьмешак над ёй другіх людзей, тут паўстала прад ёй. З чарады гэтых вобразаў выплыла аднекуль постаць яе сястры, заплаканы твар, калі яна ішла ў горад на працу. І вось, яна цяпер вясёлая там, ня гледзячы на цяжкую працу, нешта з некім робіць для

палепшаньня жыцьця, змагаецца з тымі, хто нічога ня робіць, так як і Сыманчук, а прыгнятае другіх.

І пры ўспаміне аб невядомых, але блізкіх людзях ёй, аб сястры—радасныя надзеі агарнулі Арыну.

IV.

Гэты дзень... і думкі яе так глыбака запалі ў душу Арыны, што яны і цяпер ясна стаяць у яе памяці. Бо толькі ў гэты дзень Арына ясна ўбачыла прад сабой два лягеры сярод людзей—адны людзі нават палец аб палец ня ўдараць і жывуць у роскашы, у бляску, а другія на іх робяць, ім падчыняюцца, і жывуць у страшнай беднасьці, у сырых і нізкіх дзеравяных хатках, дзе хваробы, дзе сьмерць і сьлёзы, дзе рэдкая, як на твары старога, усьмешка, радасьць...

Сягоньня, як і калісьці даўно, Арына атрымала пісьмо ад Мані.

Арыне ўжо ня прыходзілася хадзіць да каго-небудзь чытаць пісьмо, бо яна ў гэтым годзе цэлую зіму наведвала школу ліквідацыі няграматнасьці.

Маня пісала:

„Даражэнькая сястрычка Арына, хоць мне страшна часу няма, але я не магу не напісаць некалькі слоў табе. Я пішу ў Ленінскім кутку, дзе шмат нашых работніц, дзе размалёўваецца нашымі мастакамі насьценная газэта да Першага мая. Вось радам са мною сядзіць наш рэдактар насьценнай газэты—рабочы заводу, тав. Сапронаў, і ганяе мяне, каб я дапісвала ўспаміны ў газэту—„Як мы сьвяткавалі Першае мая ў старыя часы". Ён піхае пад локаць маёй рукі і пытаецца: „каму гэта я пішу пісьмо—ці ня хлопцу?" Сьмешны ён і вясёлы! Вось што, дарагая Арыначка (а то я загаварылася ўжо), што хацела сказаць я табе, гэта тое, што я з групаю сваіх работніц заводу прыеду на другі дзень мая ў ваш раён для праводжаньня сьвята. У гэты-ж дзень, здаецца (ты мне-ж пісала), будзе ў вас спэктакль і выпуск няграматных. Як я рада за цябе, Арыначка, што ты ўжо можаш чытаць і сама пішаш пісьмы! Цалую старых, і кланяйся ад мяне свайму Юзіку і брату Сымону. Ён-жа комсамолец, здаецца? Хутка ўбачымся. Няма часу, бо мяне зноў пачынае падганяць наш рэдактар.

Твая Маня".

Арына перачытвала пісьмо некалькі разоў, і ёй не хацелася ўспамінаць, не хацелася варушыць бруднай, праклятай мінуўшчыны. Яе цягнула на двор, дзе сонца, дзе радасьць, дзе стукаюць тапары—сусед іх будуе новы ток. Яе ап'яняе гэты смалісты пах новых будынкаў пасёлку. І як усё зьмянілася! Як усё тут радуе сэрца!

На дварэ сядзіць Арынін бацька, стары, пасівеўшы. Ён ужо ня войкае па начох, а другі раз сон бывае ў яго крэпкі, як у здаровага чалавека.

Унізу, у лагвішчы, ходзіць нечага каля свайго будынку Сыманчук і ўсё паглядвае ў гэты бок. Як яму не па душы гэты зграбны пасёлак ды з яго яшчэ лесу! Але зноў Арыне ня хочацца варушыць гэтых брудных успамінаў душы свае, пра тое, як яны ўдваіх з Юзікам пасьля рэволюцыі ўзбудзілі хадайніцтва аб абрэзцы зямлі ў Сыманчука, як яны арганізавалі пасёлак ды пажаніліся. Не, ня гэта хочацца ўспамінаць Арыне! Арыне хочацца насіць у душы нешта сьвятое, сьветлае, як у той час, калі Маня, яе сястра, першы раз пісала ёй пра „Май".

Расьцьвітае поле, кіпіць і радуецца зямля. Па мястэчку праходзяць колёны за колёнамі людзей, грыміць музыка.

Людзі падыходзяць да пэрону вакзала, пасьля чаго неўзабаве падыходзіць цягнік, але ўжо не таварны і не з машынамі, як надоечы, а пасажырскі.

— З гораду,—падаюць галасы, і неўзабаве чутно працяжнае—Ура-а-а!—і музыка.

Весяліцца вясна, весяляцца людзі. Радуецца шэрае вясновае поле, што ляжыць за мястэчкам і чакае прывезеных з гораду плугоў.

Люся Сьвідэрская.

Что сказал 8-й С'езд Советов

Со времени 7-го с'езда советов прошло два года. За эти два года наша промышленность и сельское хозяйство достигли довоенного уровня. Завершен восстановительный период. И 8-й с'езд советов БССР знаменует собой новую полосу, когда мы обоими ногами становимся на путь дальнейшего развития нашего хозяйства, на путь социалистического строительства.

Довоенный уровень нас уже не может удовлетворить. Ведь белорусская промышленность самая отсталая во всем Союзе. Она составляет только 1,16 проц. всей союзной промышленности. Наша задача итти все вперед и вперед.

И на 8-м с'езде очень часто на всякие лады повторялось слово „индустриализация". Его повторяли почти во всех своих выступлениях и рабочие, и работницы, и крестьяне, и крестьянки.

Индустриализация БССР.

Индустриализировать нашу Советскую Белоруссию значит прежде всего укрепить и расширить нашу промышленность.

С'езд утвердил представленный правительством план развития промышленности. По этому плану в течение ближайшего пятилетия намечается расширение ряда отраслей нашей промышленности среди них деревообделочной, бумажной, спичечной, металлообрабатывающей, текстильной и других. Намечается постройка целого ряда новых заводов.

Использовать полностью все те богатства, все то сырье, которое имеется в Советской Белоруссии — вот какую задачу поставил перед нашей промышленностью с'езд, использовать наш лес, наши ископаемые, фосфориты, глину, песок, запасы сельско-хозяйственного сырья.

Новые огни на Осиновом болоте.

Огромные пространства нашей республики, десятки тысяч десятин покрыты торфяными болотами. Торф — прекрасное дешевое топливо, при помощи торфа мы получим дешевую электрическую энергию для нашей промышленности. Пятилетний план предусматривает постройку Осиновской электростанции.

На Осиновом болоте зажгутся новые огни, электрическая энергия вольет новую мощную силу в наши фабрики и заводы. Советская Белорусь станет твердо на путь электрификации, по которому легче всего двигаться вперед к социализму.

В результате всех этих мероприятий в ближайшие пять лет продукция нашего хозяйства увеличится в два раза, она достигнет 200 миллионов рублей, что даст возможность втянуть новые тысячи рабочих и работниц в производство.

Индустриализация нашей страны тесно связана с развитием сельского хозяйства.

Даешь хороший урожай.

И 8-й с'езд постановил—наша промышленность должна черпать сырье для обработки прежде всего с местного белорусского рынка. Увеличить товарность сельского хозяйства—вот очередная задача. Для этого каждый крестьянин должен стремиться увеличить урожайность своего поля.

„Даешь хороший урожай"—

вот лозунг, под которым проходил с'езд. С'езд призвал крестьянство Советской Белоруссии увеличить посевы всяких технических культур, которые могут быть переработаны промышленностью.

С'езд утвердил предложение правительства о предоставлении на нужды сельского хозяйства 96 миллионов руб. Эти деньги помогут крестьянству перейти на более культурные формы обработки земли, они пойдут на оказание помощи бедноте, на укрепление коллективных хозяйств, на укрепление социалистических элементов в деревне.

Поднять на высшую ступень нашу промышленность и сельское хозяйство, улучшить условия жизни трудящихся масс, дать рабочему хорошие жилища, об'явить беспощадную войну нашей отсталости, некультурности,—проклятому наследию прошлого,— вот те задачи, которые, наметил в своем докладе глава правительства тов. Адамович, вот основное содержание всех постановлений с'езда.

О чем говорили делегаты.

Один за другим подымались на трибуну делегаты с'езда и говорили об этих задачах. Много было среди выступавших и работниц и крестьянок.

Делегатки с'езда говорили о том сдвиге, который имеется в городе и деревне среди широких женских трудящихся масс, о росте активности работницы и крестьянки. Но много работы еще впереди. Нужно поднять квалификацию женского труда, поднять культурный уровень трудящейся женщины, ликвидировать безграмотность. Нужно дать деревне хорошую школу, больницу, ясли.

Совещание делегаток 8-го Всебелорусского С'езда Советов.

За улучшение условий жизни работницы, за новый быт, за новую культурную деревню ратовали делегатки 8-го с'езда советов.

Нашей ближайшей задачей на социалистическом пути—это борьба с бюрократизмом за упрощение советского аппарата и за снижение цен.

С'экономить на чиновничьем аппарате, чтоб эти деньги перебросить на нужды промышленности, сделать аппарат более гибким, более соответствующим нуждам широких масс, снизить цены, сделать товар более доступным потребителю.

Все эти задачи огромной важности, вокруг которых необходимо сосредоточить внимание советов, внимание широких трудящихся масс, внимание трудящихся женщин.

Больше активности.

Все больше и больше активной должна стать работница и крестьянка, она должна вести неустанную борьбу с тем старым укоренившимся взглядом на женщину, что ее место только на кухне.

Этот отживший взгляд о женщине крыл на с'езде тов. Адамович, касаясь вопроса о снижении процента женщин в некоторых сельсоветах. Он крыл наше неуменье подойти к новому работнику, в том числе и к женщине, чтобы научить его работать.

Делегатки с'езда:
1. Скворцова В. Бобруйск. фабр. Деревообделочник
2. Пирогова В Бобр. окр. 1 район. Харлаповичи.

„Нужно—говорил тов. Адамович — работницу и крестьянку поставить на руководящую работу, побольше ее выдвигать, чтоб на этой работе она могла расти и развиваться".

— Более широкое, смелое выдвижение женщин-работниц и крестьянок, более широкое вовлечение рабочих и крестьянских масс в дело строительства социализма — вот что сказал 8-й с'езд советов.

В этом наша сила. В этом залог того, что мы пойдем все вперед и вперед к новым социалистическим завоеваниям.

Наша конституция закрепляет те достижения, которых трудящиеся под руководством коммунистической партии добились на протяжении 10 лет борьбы.

С'езд утвердил конституцию БССР.

Основные положения конституции: Диктатура пролетариата, тесный союз между рабочим классом и крестьянством, полное всестороннее разрешение внутри нашей республики национального вопроса, тесное сотрудничество со всеми советскими республиками, входящими в состав единого СССР, строительство социализма под руководством коммунистической партии.

Делегатка с'езда тов. Дакука.

Мы растем.

Во всей работе с'езда бодро звучала уверенность в правильности нашего пути, глубокое сознание нашей силы.

Об этом прекрасно сказала в своем выступлении работница делегатка с'езда Кротова, говоря о достижениях на своей фабрике. Пускай,—сказала она,—международные хищники-капиталисты нагородили на нашем пути страшные леса, пускай стерегут нас страшные звери, но мы не боимся никаких зверей, ибо мы бьем по капитализму нашей организованностью. Мы растем.

В этом наша сила, сила великой Октябрьской революции.

Р. К—н.

Словы дэлегатак на VIII-м Усебеларускім Зьездзе Саветаў

З агульнага ліку дэлегатаў VIII-га Усебеларускага Зьезду Саветаў—68 жанчын. Сабраўшыся з глухіх і далёкіх куткоў Беларусі, яны прыехалі сюды, у Менск, вырашаць агульнадзяржаўныя задачы і вызначыць шлях надалей. Вось нашто зварачваюць сваю ўвагу дэлегаткі:

Патрэбны ясьлі.

Тав. *Юшкевіч* кажа:—Сотні вёсак у нас земляўпарадкаваліся, але ня гледзячы на гэта усё такі на гэтых пасёлках малая ўраджайнасьць. Галоўная прычына неўраджайнасьці гэта тое, што пасёлкі вядуць старую сыстэму землякарыстаньня, трохполку.

Тав. Юшкевіч.

Сельска - гаспадарчы падатак у гэтым годзе значна зьніжан, але ў некаторых мясцох неправільна разьмяркован. Шмат ёсьць выпадкаў, калі звальняецца ад падатку тая гаспадарка, якая можа плаціць.

Аб торфадабываньні даўно ўжо разважае насельніцтва, але адна бяда ў тым, што ў нас няма такіх людзей, якія-б паказалі, як дабываць гэты торф і як ім тапіць печы.

На летні час трэба паклапаціцца аб ясьлях—вываліць жанчыну ад гэтае цяжкае працы, каб яна не насіла за плячыма дзіцяці, як гэта было раней, калі ідзе на поле жаць, а каб астаўляла ў ясьлях. Трэба дзеля гэтага пашырыць колькасьць ясьляў. На гэта, калі будзе разглядацца наш бюджэт, трэба зьвярнуць увагу і адпусьціць сродкі на летнія ясьлі.

Тав. Пузанкова.

Дайце школу.

Тав. *Пузанкова* з Калініншчыны кажа:

— Земляўпарадкаваньне ўнас праводзіцца вельмі марудна—не хапае каморнікаў-агрономаў, ніхто ня кіруе гэтай працай. Мала ўвагі зьвяртаецца на няпісьменнасьць. Шмат дзяцей сядзіць на печы і ня вучыцца. У мястэчку Хацімск ёсьць сямігодка, але туды пападаюць не беднякі, а больш заможныя.

Трэба палепшыць мэдыцынскую дапамогу ў вёсцы, даць па добраму доктару на кожны раён, прыслаць у вёску больш мэдыкамэнтаў.

Дрэнна справа абстаіць з кватэрамі.

Работніца заводу імя Домбаля (Нова-Барысаў) тав. *Дакука*, цэхорганізатар шліфавальнага аддзяленьня заводу, расказвае:—Прадукцыйнасьць працы ў параўнаньні з мінулымі гадамі паднялася, гатунак шкла палепшыўся, але бяда—машыны састарэліся. Трэба набыць новае абсталяваньне.

Да нас на завод паступіла шмат новых рабочых—выхадцаў з вёскі. Яны адстаюць ад нашых старых рабочых. Пара ўзяцца за іх апрацоўку, падняць іх культурны ўзровень, навучыць пісьменнасьці.

Адно гора з кватэрамі: агульныя памяшканьні перапоўнены народам, няма месц, кватэры цесныя.

Трэба правесьці земляўпарадкаваньне.

А вось тав. *Калмачэўская* з вёскі Залуч, Асьвейскага раёну, Полацкае акругі, кажа:

— Наша вёска была канчаткова зруйнавана палякамі, а мяне паны пагналі далёка на пазыцыі, у акопы.

За 7 год вёска стала трохі на ногі. Адчынілі фэльчарскі пункт, пошту наладзілі і г. д.

Ужо пяць год яна дэлегаткай, член сельсавету. Патрэбы роднай вёскі ёй асабліва блізкі. Земляўпарадкаваньне не праведзена, а ўся зямля ў вузенькіх шнуркох, лесу мала даюць на пабудову і на атапленьне.

Аб нацполітыцы.

З Гомельскай акругі, Чачэрскага раёну, з вёскі Рудня тав. *Ключынская Браніслава* кажа:

— На Ўсебеларускім Зьезьдзе Саветаў я бачу дэлегатаў ад розных нацый.

У нашай вёсцы ёсьць польская школа, але дзяцей вучыцца вельмі мала; дзякуючы царскаму ўраду шмат хто забыўся сваёй роднай мовы, але да яе прыхільны. Нашы сяляне вельмі ўдзячны Савецкай ўладзе за правядзеньне нацыянальнай палітыкі і за тое, што можна вучыць дзяцей на сваёй роднай матчынай мове.

Вось што кажуць дэлегаткі, зьехаўшыся на 8-мы Усебеларускі Зьезд Саветаў. Галоўнае і балючае пытаньне, аб чым гаварылі дэлегаткі, гэта — земляўпарадкаваньне, як-бы найхутчэй збавіцца ад трохпалёўкі, ліквідаваць цераспалосіцу пашырыць сетку школ, даць добрых вёсцы дактароў, даць лесаматар'ялу, а гэтак і апалу сваечасова. А таксама пашырыць сетку ясьляў і мэліорацыйных таварыстваў і апальваць торфам, каб захаваць лес—багацьце Беларусі.

Тав. Ключынская.

У. Б.

НА ПРОИЗВО

СРЕДИ БЕЛЫХ

(На заводе „Дерево

В Минске, на Комаровской окраине, где деревянные домики низко-низко прильнули к земле, где от поломанных тротуаров весною и осенью не пройти из-за грязи, приютился завод „Деревообделочник".

С самого утра начинает гудеть по всей окраине „Деревообделочник". Весело гудит.

Белоруссия—страна болот, лесов.

Болота сушат у нас мелиоративные общества.

Леса берут в обработку специальные заводы. „Деревообделочник" один из них.

На „Деревообделочнике" сейчас 180 рабочих. „Деревообделочник разбит на цехи. В одном из них вы увидите как толстые корявые бревна плавно пилятся серебристыми ножами-пилами, на тонкие свежие доски. В другом—как сколачивается мебель. Это самый интересный цех. Свежие, тонкие доски изумительно режут, строгают, сбивают. И вот перед вами на складе горы новеньких табуреток, столов, разно-разнейших шкафиков.

Если даже вы не пишете стихов, все равно в шумных, клокочущих машинами, цехах вас потянет делать в такт, что нибудь музыкальное.



Каган Соня—полировщи



Рейнгольд Лейка работает у ленточной пилы.

Из 180 рабочих, занятых на заводе, 15 женщин. В большинстве своем женщины заняты у машин, некоторые из них работают в полировочном цехе. В цехе, где царит вопро... жгучий запах политуры.

На заводе „Деревообделочник" женский тру... применяется всего лишь два года. Вот подойдите вы сейчас к старшему мастеру завод... к тов. Гольдбергу.

Кружок кройки и шитья при клубе Ильи

ВОДСТВЕ

ЫХ СТРУЖЕК

Деревообделочник").

Спросите вы у т. Гольдберга, как работают женщины у верстака и у машины.

Ответ будет один.

— Прекрасно, прекрасно. Сверх ожиданий.

И это правда. У станка успевают. Но и после рабочего дня, в общественной работе первые.

Вот они:

Катя Покумейко.

Соня Каган.

Лейка Рейнгольд.

Пришли на завод не только рубанка в руках держать не умели, может стружек никогда в глаза не видели.

А теперь любо смотреть.

Весело кипит, весело спорится труд в рабочих руках.

Они втроем: Катя Покумейко, Соня Каган, Лейка Рейнгольд первые активистки, первые общественницы на заводе. Покумейко—секретарь комсомольской ячейки, Каган—в пионер-отряде. Работают в завкоме, пишут в стенной газете „Красный Деревообделочник", участницы всех комиссий. Но это только три—а на заводе таких 15.

полировщица.

